# IV. СИМВОЛІКА ТА МІФОЛОГІЯ У МИСТЕЦТВІ

УДК 745.52.048+398](476)

**Людзміла АГЕЕВА**

## Архаічныя вобразы культа продкаў у народным арнаменце беларусаў

На прыкладзе двух беларускіх ручнікоў канца ХІХ і сярэдзіны ХХ ст. у артыкуле разглядаецца семантыка архаічных выяў беларусаў, якія тычацца культа продкаў. Хоць гэтыя выявы маюць рознае паходжанне (паганскае і хрысціянскае), яны маюць агульную традыцыю, якая сыходзіць у далёкія часы. У артыкуле паказаны старажытны спосаб перадачы ідэі праз піктаграмы.

*Ключавыя словы:* народны арнамент, культ продкаў

**Liudzmila Aheeva**

**Archaic images of the ancestor worship in national ornament of Belarusians**

On the example of two Belarusian ceremonial towels of the end of the 19th and the middle of the 20th century the semantics of Belarusian images associated with the ancestor worship is considered. Though these images have a different origin (pagan and Christian), they have the general tradition going to ancient times. The ancient way of conveying ideas using pictograms is shown.

*Keywords:* national ornament, the ancestor worship

**Людмила Агєєва**

**Архаїчні зображення культу предків у народному орнаменті білорусів**

На прикладі двох білоруських рушників кінця ХІХ та середини ХХ ст. у статті розглянуто семантику зображень білорусів, пов’язаних із культом предків. Попри різне походження цих зображень (язичницьке і християнське), вони мають спільну традицію, що бере свій початок у давні часи. Показано стародавній спосіб передавання ідей за допомогою піктограм.

*Ключові слова:* народний орнамент, культ предків

Народныя тканіны даследуюцца ўжо даўно і мноствам аўтараў, аднак у іх знакавай прасторы яшчэ можна сустрэць рэдкія выявы, трактоўка якіх даследнікамі пакуль што не прапанавалася. Таму ў дадзеным артыкуле намі будуць даследаваны два беларускіх ручніка, адзін з якіх знаходзіцца ў калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры



*Іл. 1. Ручнік з калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры НАНБ, сяр. XX ст.*



*Іл. 2. Беларускі ручнік з Магілеўскай вобласці. 1890 г. [8, с. 108]*

АН Беларусі (*іл. 1*) і датуецца сярэдзінай XX ст., а другі аднойчы надрукаваны ў манаграфіі В. Я. Фадзеевай у 1994 г. [8, с. 108]. Ен паходзіць з Магілеўскай вобласці і датуецца канцом XIX ст. (*іл. 2*). У нашым артыкуле разглядаецца семантыка архаічных вобразаў гэтых двух ручнікоў, якія, па нашым меркаванні, маюць дачыненне да аднаго і таго ж культу.

Народныя тканіны ўключаюць у сябе розныя тыпы сімволікі, у тым ліку кампазіцыі з геаметрычных знакаў, графічныя ідэаграмы, якія, як адзначалася Е. Н. Клетновай, могуць быць правільна зразуметы толькі пры вывучэнні ідэй, якія пакладзены у іх аснову [3, с. 113]. Ручнік, прадстаўлены на *іл. 1*, нядаўна паступіў у калекцыю Музея старажытнабеларускай культуры АНБ. Яго асаблівасцю з’яўляецца бардзюрны арнамент па ўсіх баках ручніка, а яго канцы абапал завяршаюцца матывам, які падобны на хаткі (*іл. 3*). Стылістычныя асаблівасці дадзенага ручніка дазваляюць аднесці



*Іл. 3. Фрагмент ручніка № 1 з матывам "хаткі"*

яго да так званых кралевецкіх ручнікоў. У параўнанні з беларускімі традыцыйнымі ручнікамі, для гэтых ручнікоў характэрна спалучэнне белага і чырвонага колераў і багатая арнаментыка па ўсім полі ручніка. Ткацкая прамысловасць ў г. Кролевец была заснавана з гадзін узнікнення гэтага пасёлка, у 1601 г., а ў 1863 г. на фабрыцы працавала ўжо 208 ткачоў. У канцы XIX ст. ткацтва стала прыватнай прамысловасцю. Часцей за ўсё, кралевецкія ручнікі багата арнаментавааныя, яскравыя вясельныя ручнікі ці набожнікі, якімі ўпрыгожваліся абразы. Тыпы такіх ручнікоў сустракаюцца не толькі ва Ўкраіне, але і ў Беларусі, Смаленшчыне, Паўднёвай Расеі.

Разглядаемы намі ручнік утрымоўвае шэраг сімвалаў, якія могуць даць магчымасць інтэрпрэтаваць яго прызначэнне: сякеры-лабрысы, качкі, трохсвечнікі, вазоны з кветкамі, а таксама стылізаваныя хаткі, якія ідуць асобна ў компаноўцы па тры адзінкі па канцах ручніка. Бардзюр са стылізаваных сякер аблямоўвае ўсю арнаментальную кампазіцыю, акрамя "хатак". Гэты ручнік выкананы ў бела-чырвоных колерах і даўжыню каля чатырох метраў. Яго малюнак падзяляецца на дзве часткі ў сярэдзіне палатна, канцы якога люстэркава падобны адзін да другога. Такі спосаб месцавання арнаменту дазваляе двум канцам ручніка выглядаць аднолькава, калі ён вісіць, напрыклад, на абразе.

Як вядома, сякеры ў старажытнасці лічыліся і прыладай працы, а таксама і зброяй, а кудмені ці малюнкі сякеры лічыліся абярэгамі, паколькі ментальна перадавалі абстрактную ідэю сілы. Сама выява сякеры можа атаясамляцца са словамі "дужы" і "моцны". Яго шматлікія выявы ў арнаменце рытуальнага ручніка могуць казаць аб жаданні ўзмацніць ідэю абярэга шматразова. Такі спосаб існуе, напрыклад, ў мове, калі мы прамаўляем нейкае слова, паўтараючы яго 2-3 разы, напрыклад, у словах: моцна і моцна-моцна; хутка і хутка-хутка, далёка і далёка-далёка. У круг абярэгавых знакаў нашага ручніка ўваходзіць трохсвечнік, які калісьці быў культавым прадметам. Ён мог сімвалізаваць абстрактнае паняцце жыцця наогул, у прыватнасці, мінулае, сучаснасць і будучыню, а ў хрысціянскі час мог звязвацца з Тройцай. Выяву вазонаў з кветкамі можна тлумачыць як жаданне росквіту. Малюнак качак звычайна сімвалізуе вяселле, паколькі у фальклоры гэтыя птушкі фігуруюць як сваты не толькі ў Беларусі, але і ў Расеі ў Валагоцкай губерні, Украіне і Балгарыі. У форме качкі пяклі вясельны "курнік" у Расеі ў Томскай вобласці [7, т. 5, с. 383]. Аднак, па звестках І. А. Швед, качка часам магла таксама сімвалізаваць і душу тапельца [9, с. 614–620], а значыць, магла атаясамлівацца з душой продка.



*Іл. 4. Надмагільны "церамок", в. Боркі Клічаўскага р. Магілёўскай вобл. [2, с. 242]*

Малюнак хатак па-за межамі вышэйпаказаных знакаў, аддзеленых трыма шырокімі чырвонымі палосамі, можа казаць нам пра тое, што гэты знак, верагодна, звязаны з культам продкаў. Падставай для такога меркавання могуць служыць стараверскія традыцыі ствараць для памерлых на могілках так званыя "церамкі" (*іл. 4*) [2, с. 242], а пазней – крыжы з дахамі, якія імітуюць дамавіну (*іл. 5*) [1, с. 27]. Такія магільныя "церамкі" існавалі ў Беларусі яшчэ ў пачатку XX ст. Надмагілля з церамкамі ў Аршанскім павеце канца XIX ст. былі апублікаваны В. А. Лабачэўскай па архіўных матэрыялах [5, с. 67]. А спалучэнне крыжа з дахам, якія імітуюць магільныя "церамкі", можна сустрэць дагэтуль, асабліва на Палессі. У XVII ст. у гэтых мясцінах асела шмат беглых старавераў з поўначы Расіі. Беларускае слова "дамавіна" (гроб) сведчыць пра тое, што калісьці традыцыя ствараць "церамкі" на магілах была шырока распаўсюджана. У наш час гэты звычай часткова захаваўся ў сучаснай Румыніі.

Да культу продкаў, хутчэй за ўсё, можна аднесці і другі ручнік, канца XIX ст. з Магілёўскай вобласці, які паказаны на *іл. 2* [8, с. 108]. Тры дзіўныя выявы ўверсе могуць нагадваць нават іншапланецян. Прымаючы да ўвагі спецыфіку старажытнага мыслення, гэтыя выявы, хутчэй за ўсё, уяўляюць сабой светлячкоў, якія, калісьці, як і мурашкі, атаясамліваліся з душамі продкаў. Казурка мае доўгія вусы, шэсць лапак, і брушка, якое быццам ззяе. Гэтае ззянне на ручніку паказана ў выглядзе прамяністага круга. Здольнасць светлячкоў свяціцца ў цемры атаясамлівалася ў старажытнасці са



*Іл. 5. Староверскія надмагільныя помнікі [1, с. 27]*

святлом зорак на небе, якія часам могуць і зваліцца з неба на зямлю. Дагэтуль існуе павер'е пра зорку, якая ўпала з неба, як пра упалую душу чалавека, людзі верылі, што у гэты момант хтосьці памёр і ператварылўся ў святлячка. Існавалі павер'і, што людзей на Зямлі столькі ж, колькі і зорак на небе. Доказам таго, што дадзены ручнік можа быць звязаны з культам продкаў, можа сведчыць таксама малюнак вялікай колькасці крыжоў пад малюнкам светлячкоў.

Можа здацца, што выявы казурак на ручніках малаверагодны. Аднак у старажытнасці існаваў культ казурак не толькі, напрыклад, у Егіпце, дзе жук скарабей лічыўся святым. На Палессі захаваліся паданні пра культ павука, малюнак якога можна ўбачыць на беларускім ручніку сярэдзіны XX ст. з Валожынскага р. Менскай вобласці [4, с. 270], а таксама выяву пчол – на беларускім ручніку з Магілёўскай вобласці [4, с. 127]. Па павер'ях лужычан, жук-вадамер – "шчаслівы жучок", які прыносіць шчасце. Калі вылавіць яго з вады левай рукой і насіць пры сабе, у кашальку або ў кішэні, гэта прынясе поспех або дазволіць знайсці грошы [7, т. 5, с. 226]. Душы продкаў маглі ператварыцца і ў матыля ці іншых казурак. Існавалі паданні пра душу чалавека і яе падарожжа пасля смерці ў першыя 40 дзён. У сувязі з гэтым існаваў звычай на падваконніку (на стале, каля абразоў) пакідаць ваду, хлеб, ручнік, каб душа магла паесці, памыцца і ўцерціся [7, т. 5, с. 228].

Ручнік з Магілёўскай вобласці цікавы яшчэ адной дэталлю – чатырохкратным малюнкам адной манаграмы паміж светлячкамі (*іл. 6*). Гэта яшчэ адзін спосаб пазначыць знак сям'і. Падобныя знакі ў XX ст. рэдка сустракаюцца ў народных тканінах. Часцей на ручніках можна сустрэць гафт ініцыялаў або прозвішча гаспадыні, напрыклад, на ручніку пачатку XX ст. з Магілёўскай вобласці вышыта: "Е. Е. Данилова" [8, с. 142], альбо "Х.Т." – з Гомельскай вобласці [8, с. 70]. У XIX



*Іл. 6. Манаграма з ручніка № 3*



*Іл. 7. Фрагмент налобніа наміткі, канец XIX ст., в. Усышкі Быхаўскага ўезду Магілеўскай вобл. [6, с. 214]*

ст. ў побыце існавалі *тамгаабразныя* знакі, адзін з іх, падобны на трохсвечнік, рэканструяваны па арыгінале XIX ст., які захоўваецца ў Расійскім этнаграфічным музеі ў С.-Пецярбурзе [6, с. 214, мал. 43-1] (*іл. 7*). Гэта так званы налобник на галаўным уборы намітцы, які складаецца з шматразова паўтаральнай графемы каля 15 см даўжыні, што нагадвае трохсвечнік. Знак адлюстроўваецца то ў прамым, то ў перагорнутым выглядзе. Гэты ўзор наміткі меў распаўсюджанне ў в. Усышкі Быхаўскага р. Магілёўскай вобласці ў XIX стагоддзі, а таксама ў Смаленскай вобласці ў пачатку XX ст.

У выніку можна зрабіць выснову, што на беларускіх ручніках сустракаюцца рэдкія малюнкі, звязаныя з культам продкаў. Выявы ў выглядзе "церамкоў" на ножцы, падобныя да стараверскіх надмагільных дамавін, выяўленыя намі толькі на кралевецкіх ручніках з Украіны. Іншы малюнак душ продкаў у выглядзе "светлячкоў" сведчыць пра тое, што ў старажытнасці ў славянаў існавалі вераванні ў інкарнацыю душ, у нашым выпадку – ператварэнне ў светлячкоў. Магчыма, малюнак казуркі на беларускім ручніку таксама звязаны з татэмам сям'і з роду Жукавых, Жук, Жукевіч. Сярод піктаграфічных малюнкаў, якія можна сустрэць на беларускім народным тэкстылі, сустракаюцца рэдкія спосабы ўставіць у арнамент знакі прыватнай прыналежнасці ручніка да якой-небудзь сям'і, альбо да асобнай персоны. Гэта, у сваю чаргу, сведчыць пра існаванне калісьці знакаў кланавай прыналежнасці, альбо тамгі сям'і. Увогуле, піктаграфічныя выявы беларускіх ручнікоў – даволі цікавая з'ява ў гісторыі народнага мастацтва.

1. Велецкая Н. Языческая символика славянских архаических ритуалов. Москва: Наука, 1978. 239 с.

2. Дучыц Л., Клімковіч І. Язычніцтва старажытных беларусаў. Мінск: Харвест, 2014. 368 с.

3. Клетнова Е. Н. Символика народных украс Смоленского края. Смоленск, 1924. 113 с.

4. Лабачэўская В. А. Повязь часоў. Беларускі ручнік. Мінск: Беларусь, 2009. 209 с.

5. Лобачевская О. А. Белорусский народный текстиль. Мінск: Бел. наука, 2013. 527 с.

6. Лобачевская О. А., Зимина З. И. Белорусский народный костюм. Мінск: Белорусская наука, 2013. 280 с.

7. Славянские древности: этнолингв. слов.: в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. Москва: Международные отношения, 2004–2012. Т. 5. С. 383.

8. Фадзеева В. Я. Беларускі ручнік. Мінск: Полымя, 1994. 328 с.

9. Швед І. А. Качка ў традыцыйнай карціне свету беларусаў. *Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў*. Мінск: Права і эканоміка, 2018, 790 с.